усіх лесагаспадарчых і лесанарыхтоўчых работ. Рэалізацыя драўніны на корані павінна праводзіцца шляхам аўкцыёнаў, на якіх усе лесакарыстальнікі павінны ўдзельнічаць на роўных умовах. Таксама неабходна арганізацыя эфектыўнай сістэмы падрыхтоўкі кадраў лесанарыхтоўшчыкаў (на прыкладзе такіх замежных краін, як Швецыя, Фінляндыя).

## ЛІТАРАТУРА

1. Телегин Н.П. Комплексное лесное хозяйство северных стран Европы. – М.: Лесн. пром-сть, 1979. – 240 с.
2. Волков В.О. Лесная промышленность зарубежных стран. – М.: Лесн. пром-сть, 1987. – 200 с.
3. Петров А.П. , Логацкий В.Н. Аренда лесов в Канаде. Обзорная информация.– М.: ВНИПИЭИлеспром, 1991. – 44 с.

УДК 630*6

Д.Ф. Матусевіч, аспірант; А.В. Зубкевіч, аспірант

## ФАРМІРАВАННЕ ПЛАТНАГА ЛЕСАКАРЫСТАННЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ І ЗАМЕЖНЫХ КРАІНАХ

The history of formation of the chargeable forest utilization in the Republic of Belarus is represented; present system of chargeable forest utilization and foreign experience is being analyzing.

Развіццё платнага лесакарыстання на Беларусі мае глыбокія гістарычныя карані. Так, ужо з XII ст. за выпас жывёлы, паляванне, бортніцтва ў княжацкіх лясах пачала брацца плата. У гэты час з'явіліся першыя заканадаўчыя акты, якія рэгулявалі права ўласнасці і карыстання зямельнымі ўгоддзямі. Для гэтага перыяду характэрна карыстанне пабочнымі прадуктамі лесу (паляванне, бортніцтва і г.д.), і менавіта гэтыя віды лесакарыстання пачалі ажыццяўляцца на платнай аснове. Драўніна не набыла дагэтуль уласцівасці тавару і не валодала абменнай вартасцю. Аднак паступова з развіццём народнай гаспадаркі, хуткім ростам гарадоў, развіццём прамысловасці ўзрастала патрэба ў вялікай колькасці драўніны. Нарыхтоўка лесу і дастаўка лясных матэрыялаў на рынак зрабілася вельмі прыбытковай справай для лесапрамыслоўцаў і для лесаўладальнікаў. Для вызначэння вартасці лясных рэсурсаў ляснічы павінен быў вызначыць магчымыя таксавыя цэны на лясныя матэрыялы, фактычны памер якіх потым удакладняўся рынкам. Першыя лясныя таксы з'явіліся ў Расіі (таксама і на Беларусі) у 1798 г., але яны былі недасканалыя. Акрамя іх існавалі іншыя формы платы за лесакарыстанне: пошліна з вырабаў, акцызная сістэма, арэндная плата за карыстанне лесам. У некаторых месцах плату за лес на корані вызначалі па наяўнасці ў вёсцы сякер і комінаў над хатамі. Толькі пасля адмены прыгоннага права ўвялі лясныя таксы і таргі на лес. Згодна з Настаўленнем для складання таксаў на драўніну [1], было вызначана, што лясныя таксы павінны зыходзіць з прынцыпаў рынкавай эканомікі. Складанне лясных таксаў патрабавала збору інфармацыі аб рынкавай цане на лясныя матэрыялы і вырабы, вартасці нарыхтоўкі ў лесе розных сартыментаў, аб сярэднім у дадзенай мясцовасці памеры прыбытку лесагандлёўца, а таксама выніках продажу лесу ў апошні час. Першапачатковая вартасць лесу складалася з таксавай вартасці і з гандлёвай надбаўкі. Права на набыццё лесу атрымліваў той, хто прапаноўваў за яго больш высокую цану.

Рэвалюцыя 1917 г. істотным чынам змяніла эканамічныя асновы лясной гаспадаркі Беларусі. Вядомы погляд К. Маркса на лес як на прыродны рэсурс, які не мае вартасці, кіраўніцтва краіны зразумела літаральна: з 1930 па 1949 г. плата за драўніну на корані ўвогуле не бралася, а ў астатнія гады яна была на вельмі нізкім узроўні і такой застаецца зараз. У гэтых умовах дзяржава вымушана была браць на сябе фінансаванне выдаткаў лясной гаспадаркі, замацаваўшы гэтым адсутнасць прамой эканамічнай сувязі паміж лясным даходам і выдаткамі на лесаўзнаўленне [2]. Усё гэта разам і прадвызначыла адносіны грамадства да лесу і драўніны як да дароў прыроды, якія не маюць вартасці.

Ва ўмовах пераходной эканомікі ў Рэспубліцы Беларусь выразна выявілася патрэба ў фарміраванні спецыяльнага механізму платнага лесакарыстання. Упершыню навукова-метадычныя асновы і сістэма плацяжоў за карыстанне прыроднымі рэсурсамі і забруджванне навакольнага асяроддзя былі распрацаваны Навукова-даследчым эканамічным інстытутам пры Джяржплане БССР у 1989 г. З пачатку 90-х гадоў на Беларусі пачала фарміравацца сістэма платнага лесакарыстання, якая павінна забяспечыць бесперапыннасць, невычарпальнасць і раўнамернасць лесакарыстання, а таксама захаванне і ўзмацненне шматбаковых экалагічных функцый лесу.

Аднак з прычыны адсутнасці тэарэтычных і метадычных асноў, а таксама дастатковай інфармацыйнай базы на Беларусі прытрымліваюцца затратнай канцэпцыі фарміраваня сістэмы платнага лесакарыстання.

Згодна з дзеючым Лясным кодэксам ( ад 8 чэрвеня 2000 г.), амаль усе віды лесакарыстання з'яўляюцца платнымі (акрамя карыстання недраўніннымі прадуктамі лесу грамадзянамі Беларусі дзеля задавальнення асабістых патрэб).

Усю сістэму плацяжоў і падаткаў на лясныя рэсурсы, якія існуюць у сучасным лясным сектары, можна класіфікаваць наступным чынам:

1. Плата за карыстанне драўнінай:
– Плата за лес на корані;
– Сумы грашовых сродкаў ад рэалізацыі драўніны на аўкцыёнах;
– Сумы грашовых сродкаў ад продажу драўніны па дагаворных цэнах;
2. Адлічэнні на пакрыццё стратаў лясной гаспадаркі:
– Сумы пакрыцця выдаткаў лесагаспадарчай вытворчасці;
– Сумы матэрыяльных кампенсацый за страты, нанесеныя лясной гаспадарцы;
3. Плата за карыстанне недраўніннымі прадуктамі лесу.

З усяго вышэйзгаданага найбольшую долю (каля 85 % агульных паступленняў) займае плата за лес на корані. Асновы сучаснага вызначэння таксавых плацяжоў былі закладзены шэрагам законаў і падзаконных актаў, прынятых у 1992–2000 гг. Атрыманыя сумы накіроўваюцца ў дзяржаўны бюджэт. Цяпер лясныя таксы вызначаюць кошт драўніны, зыходзячы з поўных выдаткаў на вядзенне лясной гаспадаркі,з улікам:

– пароды;
– якасці драўніны (дзелавая, дровы);
– памеру (вялікая, сярэдняя, малая);
– адлегласці вывазу драўніны (5 разрадаў таксаў).

Таксама пад увагу прымаецца каэфіцыент нарматыўнага прыбытку.

Трэба адзначыць, што плата за лес на корані, нягледзячы на шматлікія перагляды велічыні таксаў, мае наступныя істотныя недахопы:

– не з'яўляецца навукова абгрунтаванай, таму што новыя рэдакцыі вызначаюць памеры платы на базе планавых, а не фактычных выдаткаў;
– нізкія таксы фактычна фінансуюць лясную прамысловасць;
– таксы змяняюцца павольней, чым тэмпы інфляцыі.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што самы важны элемент сістэмы платнага лесакарыстання Беларусі не выконвае сваёй асноўнай функцыі, ужо не кажучы пра ўлік экалагічных аспектаў.

Вялікае значэнне пры ўдасканаленні сістэмы арганізацыі лесакарыстання, павелічэння ляснога даходу маюць лясныя аўкцыёны і продаж драўніны па дагаворных цэнах. Заканадаўча вызначаны працэнт (80%) з розніцы паміж аб'яўленай і аўкцыённай цаной драўніны на корані застаецца ў лясгасе, а рэшта (20%) ідзе ў бюджэт раёна, на тэрыторыі якога размешчаны лясгас.

Пры рэалізацыі драўніны па дагаворных цэнах размеркаванне сродкаў захоўваецца, але цана павінна быць не ніжэй, чым 120 % ад таксавай. Для развіцця такіх формаў патрэбна арганізацыя лясной біржы. Замяшчэнне выдаткаў лесагаспадарчай вытворчасці і матэрыяльная кампенсацыя за страты, нанесеныя лясной гаспадарцы, таксама, як паказвае праведзены аналіз, мае тыя ж недахопы, што і вышэйпералічаныя кампаненты сістэмы лесакарыстання. На дадзены момант адсутнічае адзіная методыка вызначэння коштаў на недраўнінную прадукцыю лесу. Кошты распрацоўваюцца Міністэрствам прыродных рэсурсаў Рэспублікі Беларусь, а пасля рэгулююцца мясцовымі ўладамі рэгіёнаў.

У Расіі, згодна з Федэральным лясным кодэксам 1997 г., за карыстанне лясным фондам існуюць наступныя плацяжы:
– лясныя "подати";
– арэндная плата.

Мінімальныя памеры вызначаюцца Урадам Расійскай Федэрацыі, а затым карэктуюцца ў рэгіёнах. Праведзены аналіз паказаў, што таксы дыферэнцыраваны такім жа чынам, як і ў Рэспубліцы Беларусь, але яны таксама недастаткова навукова абгрунтаваныя. Памер арэндных плацяжоў абмяркоўваецца па дамоўленасці, зыходзячы са ставак "податей". У астатніх рэспубліках былога СССР таксама вядзецца работа над фарміраваннем сістэмы платнага лесакарыстання. У такіх традыцыйна лясных краінах, як Германія, Швецыя, Фінляндыя, плата за лес на корані вызначаецца разліковым шляхам па астатковаму прынцыпу. Рынак драўніны там другасны ў адносінах да рынку канчатковай прадукцыі.

Як паказвае праведзены аналіз, у Рэспубліцы Беларусь трэба распрацаваць (з улікам досведу іншых краін) эколага-эканамічныя асновы вызначэння цэнаў усіх прадуктаў (каштоўнасцей) лясоў і ўдакладніць таксавыя плацяжы з улікам рэнтнага каэфіцыенту. Таксама для пабудовы і развіцця ўласнай сістэмы платнага лесакарыстання неабходна стварыць лясную біржу ў нашай рэспубліцы, што дазволіла б мець якасную і дастатковую інфармацыю аб лясных рэсурсах.

## ЛІТАРАТУРА

1. Наставления для составления такс на лесные материалы из казенных лесных дач. – СПб., 1883.– 90 с.
2. Столяров Д.П., Шутов И.В. Лесное хозяйство и рыночная экономика // Лесное хозяйство. – 1990. – № 11.– С. 6–7.

3. Концепция развития лесного комплекса Республики Беларусь до 2015 года. – Мн., 1999. – 116 с.
4. Лесной кодекс Республики Беларусь. – Мн., 2000. – 73 с.
5. Янушко А.Д., Санкович М.М., Желиба Б.Н. Хозрасчет и эколого-экономическая оценка земельных и лесных ресурсов в лесхозах Беларуси. – Мн., 1993. – 150 с.
6. Янушко А.Д. Лесное хозяйство Беларуси (история, экономика, проблемы и перспективы развития). – Мн., 2001. – 248 с.

УДК 630*6

А.В. Зубкевіч, аспірант

## АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ ЛЕСАНАРЫХТОЎЧАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ НА БЕЛАРУСІ

In this article the periods of forest utilization development process are marked out in time, peculiarities of logging organization form changes in Belarus are considered.

Беларусь здаўна была лясным краем, і лес у жыцці нашага народа ўвесь час займаў важнае месца: са старажытных часоў ён даваў ежу, працу, матэрыял для пабудовы жылля, гаспадарчых і абаронных збудаванняў. Дзякуючы здольнасці лясоў задавальняць разнастайныя патрэбы людзей, яны спрадвеку былі ўцягнуты ў сферу вытворчасці і сталі ў далейшым аб'ектам лесаводства. Разам з лесаводствам з'явілася і лясная гаспадарка як асаблівая галіна эканомікі. Для яе ўзнікнення нараўне з натуральнымі ўмовамі спатрэбіліся і грамадскія фактары, пэўны ўзровень развіцця прадукцыйных сіл і вытворчых адносінаў. Да іх адносяцца:

а)узнікненне і развіццё ўласнасці на зямлю, лес і іншыя прыродныя рэсурсы;

б)пераўтварэнне прадуктаў лесу і найперш драўніны ў тавар, які мае шырокае грамадскае значэнне;

в)пераўтварэнне лесу са сродку існавання чалавека ў сродак вытворчасці і самастойную сферу прыкладання працы.

Такім чынам, лясная гаспадарка ў тым выглядзе, у якім яе ведае сучасная культура, з'явілася ў сферы эканамічнага жыцця толькі тады, калі прадукты лесу набылі ўласцівасці тавару, а сам лес стаў аб'ектам прыкладання працы, калі на яго ўсталявалася тая альбо іншая форма ўласнасці [1].

Адначасова з развіццём лесакарыстання ішло развіццё лесанарыхтоўчай вытворчасці, спачатку як састаўной часткі лясной гаспадаркі. Формы арганізацыі лесанарыхтоўчай вытворчасці ў сваім гістарычным развіцці не былі статычнымі, а заўжды знаходзіліся ў працэсе пастаянных змен.

Разглядаючы гістарычны працэс развіцця лясной гаспадаркі ад першых момантаў яе ўзнікнення да цяперашняга часу, можна адзначыць перамяшчэнне цэнтра цяжару ад пабочнага карыстання лесам да прамога, ці галоўнага, карыстання лесам. Так, пры першабытнаабшчынным ладзе, які меў вельмі нізкі ўзровень развіцця прадукцыйных сіл, лясной гаспадаркі яшчэ не было. Лес для людзей быў сродкам існавання, крыніцай ежы, месцам пражывання. Ва ўяўленнях народаў таго перыяду лес быў бясконцым, што выключала ўсялякую неабходнасць рэгулявання лесакарыстання. Кожная абшчына ці род асвойвалі невялічкія кавалкі лесу каля паселішчаў для палявання, збірання грыбоў, ягад, бортніцтва. Па меркаваннях В.І. Перахода і А.Д. Янушка гэта быў перыяд